СУСТРЭЧЫ

# ЖЫВОЕ СЛОВА РОДНАЕ

**20 лістапада ў Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Янкі Купалы выступіла член Саюза пісьменнікаў Беларусі, лаўрэат Прэміі імя А. І. Дубко, паэтэса Таццяна ЯЦУК.**

Апошнім часам наша калега па пісьменніцкай арганізацыі стала абсалютным рэкардсменам па колькасці выступленняў у розных куточках Беларусі. Баранавічы, Мінск, Слонім, Нясвіж, Гродна, Брэст, Ліда… На карце творчых маршрутаў Таццяны Мікалаеўны з'яўляюцца ўсё новыя пункты. Але ў Купалаўскім універсітэце паэтэса ўпершыню.



Нагадаем: сустрэчы студэнтаў-купалаўцаў з літаратарамі Прынёмання адбываюцца рэгулярна, нашы ўзаемныя стасункі сёння можна ахарактарызаваць як сяброўскі дыялог. У значнай ступені гэта заслуга кандыдата філалагічных навук, дацэнта кафедры беларускай філалогіі ГрДУ імя Янкі Купалы, лаўрэата Нацыянальнай літаратурнай прэміі Беларусі, члена СПБ Аліны Сабуць. Менавіта Аліна Эдмундаўна стала ініцыятарам сустрэчы з сучаснай беларускай паэтэсай у сваёй куратарскай групе 2-га курса спецыяльнасці «Беларуская філалогія».

Падчас сустрэчы ў паэтычнай гасцёўні «Ажываюць словы пад пяром...», якую таксама наведала старшыня ГрАА СПБ Людміла Антонаўна Кебіч, адбылася прэзентацыя новага зборніка лірыкі Таццяны Яцук «Прага цішыні» *(Мінск, выдавецтва «Беларусь», 2025)*. У аўтарскім прачытанні таксама прагучалі вершы розных гадоў. Можна з упэўненасцю сказаць, што роднае паэтычнае слова адгукнулася ў маладых сэрцах. Сустрэча была поўная прыемных момантаў, дзяўчаты праявілі шчырую зацікаўленасць творчасцю госці, а некаторым пашчасціла атрымаць з яе рук асобнікі персанальных выданняў з памятным аўтографам. Педагог,

навукоўца, калега па СПБ Аліна Эдмундаўна Сабуць падарыла паэтцы экзэмпляр уласнай кнігі і атрымала ў падарунак аўтарскую кнігу ад Таццяны Мікалаеўны.

Што тычыцца Купалаўскага ўніверсітэту, ён трапіў на карту творчых маршрутаў Таццяны Мікалаеўны Яцук і застанецца на гэтай карце назаўсёды. Дадзены факт можа азначаць толькі адно – выступленні паэтэсы, прэзентацыі яе кніг у галоўнай вышэйшай навучальнай установе Прынёманскага краю стануць добрай традыцыяй.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ**

**На фота:** член Саюза пісьменнікаў Беларусі, лаўрэат Прэміі імя А. І. Дубко, паэтэса Таццяна Яцук у гасцях у студэнтаў 2-га курса спецыяльнасці «Беларуская філалогія» ГрДУ імя Янкі Купалы: падчас і пасля сустрэчы. Гродна, 20 лістапада 2025 года.






Члены СПБ, літаратуразнаўца, літаратурны крытык Аліна Сабуць і паэтэса Таццяна Яцук




15 16 17 18 19
22 23 24 25 26
29 30 31





ФИЛОЛОГИЧЕСКИЙ

ФАКУЛЬТЕТ